Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі
ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АСНОВЫ РЭЖЫСУРЫ І МАЙСТЭРСТВА АКЦЁРА

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці*
*1-17 01 05-1 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

Мінск
БДУКМ
2013

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. Г. Фядотаў,* дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*кафедра* рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»;
*В. С. Манаеў,* вядучы майстар сцэны дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы», народны артыст Беларусі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 27.04. 2012 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.);
*секцыяй* па спецыяльнасці 1-17 01 05-1 Рэжысура свят (па напрамках) навукова-метадычнага савета па мастацтве тэатра, кіно, радыё, тэлебачання і рэжысуры свят Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 10.10.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. В. Каташвілі
Адказны за выпуск: А. Г. Фядотаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра» распрацавана для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 01 05-1 Рэжысура свят (па напрамках).

Месца вучэбнай дысцыпліны «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра» ў сістэме мастацкіх ведаў вызначаецца прадметам яе вывучэння, якім з’яўляюцца агульныя заканамернасці акцёрскай і рэжысёрскай творчасці. Веды ў галіне класічнай рэжысуры і акцёрскага майстэрства выконваюць ролю прафесійнай базы, на якой грунтуецца галоўная спецыялізацыя будучага рэжысёра абрадаў і свят.

Актуальнасць дысцыпліны «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра» абумоўлена тым, што гэта магчымасць, па-першае, авалодаць аб’ёмам тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў акцёра-выканаўцы і рэжысёра-пастаноўшчыка, па-другое, засвоіць шырокі комплекс маральна-этычных норм творчасці, якія фарміруюць асобу мастака і грамадзяніна. Арганічнае спалучэнне гэтых двух кампанентаў складае аснову прафесійнай школы, стварае спрыяльную глебу, на якой грунтуецца і выхоўваецца асоба рэжысёра, здольнага да творчага асэнсавання складаных акалічнасцей жыцця чалавека і грамадства.

Істотным прынцыпам адукацыйнага працэсу з’яўляецца арганічная сувязь двух раздзелаў дысцыпліны – «Асновы рэжысуры» і «Майстэрства акцёра», іх комплекснае вывучэнне і непарыўнасць. Творчая праца студэнтаў патрабуе шчыльных міждысцыплінарных сувязей усяго коплексу спецыяльных дысцыплін, у ліку якіх «Моўнае дзеянне ў свяце», «Музычна-шумавое рашэнне свята», «Пластыка-харэаграфічнае рашэнне свята», «Мастацка-дэкаратыўнае рашэнне свята».

*Мэта* дысцыпліны «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра» – авалоданне студэнтамі элементамі акцёрскай і рэжысёрскай творчасці па сістэме К. С. Станіслаўскага, комплексам маральна-этычных норм сучаснага творцы і грамадзяніна, а таксама набыццё ведаў аб творчых практыках буйнейшых айчынных і замежных майстроў рэжысуры.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае рашэнне наступных *задач:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– прымяненне вучэбнай інфармацыі, звязанай з галоўнымі заканамернасцямі творчага працэсу;

– спасціжэнне студэнтамі сістэмы сусветных мастацкіх і духоўных каштоўнасцей як арыенціра для вызначэння звышзвышзадачы сваёй будучай творчасці;

– асэнсаванне працэсу развіцця рэжысуры і акцёрскага майстэрства ў гістарычным кантэксце і ў сувязі з развіццём іншых відаў мастацтва і літаратуры, агульным развіццём гуманітарных ведаў;

– выкарыстанне ў творчым працэсе педагагічнай дзейнасці ведаў з галіны айчыннай і сусветнай гісторыі мастацтваў, значных твораў сусветнай і айчыннай літаратуры і драматургіі;

– фарміраванне ў студэнтаў уласнага погляду на працэсы, што адбываюцца ў грамадстве і мастацтве, уменне самастойна аналізаваць жыццёвыя з’явы, творы літаратуры і мастацтва, а таксама ствараць новую мастацкую рэальнасць.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– галоўныя прынцыпы сістэмы К. С. Станіслаўскага і вучэнне аб тэатры У. І. Неміровіча-Данчанкі;

– прынцыпы псіхафізічнага існавання акцёра на сцэне;

– стылявыя асаблівасці акцёрскай ігры;

– сцэнічнае ўзаемадзеянне і прыроду сцэнічнага канфлікту;

– мізансцэніраванне і тэмпарытм дзеяння;

– структуры і асаблівасці арганізацыі рэпетыцыйнага працэсу.

Павінен *умець:*

– валодаць асноўнымі прынцыпамі акцёрскага майстэрства;

– выкарыстоўваць метад фізічных дзеянняў і дзейнасны аналіз п’есы і ролі ў працэсе падрыхтоўкі спектакля і ўвасаблення сцэнічнага вобраза;

– валодаць прыёмамі пластычнай выразнасці;

– прымяняць веды ў галіне акцёрскага мастацтва для выкладчыцкай дзейнасці.

У ліку эфектыўных педагагічных методык, якія спрыяюць далучэнню студэнтаў да пошуку, набыцця вопыту самастойнага рашэння разнастайных творчых задач, трэба назваць:

– праектныя тэхналогіі (творчы праект, даследчы праект, інфармацыйны праект, ролевы праект);

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, «мазгавы штурм», дыспут і інш.);

– метад сітуатыўнага аналізу;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

Для кіравання навучальным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці настаўнікам рэкамендавана выкарыстоўваць: прынцып паэтапнага кантролю, рэйтынгавыя, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. Мэтазгодна ўвядзенне ў практыку семінарскіх і практычных заняткаў методыкі актыўнага навучання, дыскусійных форм для фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетенцый студэнта.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку педагогам творчых заданняў (практыкаванняў, эцюдаў, урыўкаў), а таксама паведамленняў, тэатралізаваных аповедаў аб жыцці і творчасці акцёраў і рэжысёраў айчыннага і сусветнага тэатра, эстрады і іншых форм святочнай культуры.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра» прадугледжана 482 гадзіны, з якіх 244 – аўдыторныя заняткі (20 гадзін – лекцыйныя, 164 гадзіны – практычныя, 60 гадзін – індывідуальныя).

Рэкамендаванымі формамі кантролю ведаў студэнтаў па дысцыпліне «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра» з'яўляюцца: залікі і экзамены, на якіх студэнты павінны прадэманстраваць узровень засваення вучэбнага матэрыялу, ступень авалодання прафесійнай кампетэнцыяй па тэорыі і практыцы выканальніцкай і пастановачнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| | Колькасць аўдыторных гадзін | У тым ліку | | |
|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практ. заняткі | інд. заняткі |
| ***Уводзіны*** | 2 | 2 | | |
| **Раздзел I. Прырода акцёрскай і рэжысёрскай творчасці ў інтэрпрэтацыі сістэмы К. С. Станіслаўскага (частка 1)** | | | | |
| ***Тэма 1.*** Творчая этыка і дысцыпліна | 7 | 2 | 4 | 1 |
| ***Тэма 2***. Фізічны апарат артыста | 10 | | 6 | 4 |
| ***Тэма 3.*** Сцэнічная ўвага | 4 | | 4 | |
| ***Тэма 4.*** Імправізацыя як элемент акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства | 8 | | 6 | 2 |
| ***Тэма 5.*** Пачуццё праўды і вера | 10 | | 6 | 4 |
| ***Тэма 6.*** Сцэнічныя фантазія і ўяўленне | 10 | | 8 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Сцэнічнае дзеянне | 14 | 2 | 8 | 4 |
| **Раздзел II. Прырода акцёрскай і рэжысёрскай творчасці ў інтэрпрэтацыі сістэмы К. С. Станіслаўскага (частка 2)** | | | | |
| ***Тэма 8.*** Скразное дзеянне і звышзадача | 10 | 2 | 6 | 2 |
| ***Тэма 9.*** Рэжысёрская задача – рухавік сцэнічнага дзеяння | 10 | | 8 | 2 |
| ***Тэма 10.*** Сцэнічныя зносіны | 10 | | 8 | 2 |
| ***Тэма 11.*** Тэмпарытм сцэнічнага дзеяння | 10 | | 8 | 2 |
| ***Тэма 12.*** Народнае мастацтва – крыніца рэжысёрскага натхнення | 10 | 2 | 4 | 4 |
| ***Тэма 13***. Звышзадача мастака | 8 | | 6 | 2 |
| **Раздзел III. Рэжысёрская інтэрпрэтацыя сцэнічнага твора** | | | | |
| ***Тэма 14.*** Пераклад празаічнага твора на мову сцэнічнага дзеяння | 10 | 2 | 4 | 4 |
| ***Тэма 15.*** Рэжысёрскі аналіз празаічнага твора | 14 | 2 | 8 | 4 |
| ***Тэма 16.*** Вывучэнне асяроддзя, адлюстраванага ў творы | 6 | | 4 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ***Тэма 17.*** Канфлікт – аснова сцэнічнага дзеяння | 11 | | 8 | 3 |
| ***Тэма 18.*** Кампазіцыйная будова пастаноўкі | 8 | | 6 | 2 |
| ***Тэма 19.*** Вобразнае рашэнне сцэнічнага твора | 12 | 2 | 8 | 2 |
| ***Тэма 20.*** Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка празаічнага твора | 8 | | 6 | 2 |
| **Раздзел IV. Сцэнічнае ўвасабленне празаічнага твора** | | | | |
| ***Тэма 21.*** Праца рэжысёра з выканаўцамі | 10 | | 8 | 2 |
| ***Тэма 22.*** Асаблівасці рэпетыцыйнага працэсу | 10 | 2 | 6 | 2 |
| ***Тэма 23.*** Скразное дзеянне ўрыўка і скразное дзеянне ролі | 10 | | 8 | 2 |
| ***Тэма 24.*** Характар і характарнасць | 10 | | 8 | 2 |
| ***Тэма 25.*** Вобразнае рашэнне пастаноўкі | 12 | 2 | 8 | 2 |
| **Усяго…** | 244 | 20 | 164 | 60 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта і задачы дысцыпліны. Роля дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай адукацыі. Рэжысура і майстэрства акцёра як спосаб адлюстравання «жыцця чалавечага духу». Майстры рэжысуры, рэфарматары тэатра: К. С. Станіслаўскі, У. І. Неміровіч-Данчанка, У. Э. Мейерхольд, А. Я. Таіраў, Б. Брэхт і інш. Светапогляд мастака. Шляхі фарміравання творчай асобы.

## Раздзел І. Прырода акцёрскай і рэжысёрскай творчасці ў інтэрпрэтацыі сістэмы К. С. Станіслаўскага (частка 1)

*Тэма 1. Творчая этыка і дысцыпліна*

Адлюстраванне «жыцця чалавечага духу». Этычныя законы творчасці. Мастацкая дысцыпліна і самадысцыпліна – асноўныя прынцыпы этыкі. Студыйныя пачаткі творчасці. Сцэнічнае мастацтва і сцэнічнае рамяство. «Мастацтва перажывання» і «мастацтва прадстаўлення». Сцэнічнае рамяство і акцёрскі дылетантызм. Несумяшчальнасць дылетантызму з паняццем «школа» ў мастацтве. Дзеянне – аснова сцэнічнага мастацтва. Галоўныя прынцыпы сістэмы К. С. Станіслаўскага: 1) жыццёвая праўда; 2) ідэйная актыўнасць мастацтва, адлюстраваная ў звышзадачы; 3) сцвярджэнне дзеяння ў якасці ўзбуджальніка сцэнічных перажыванняў і галоўнага матэрыялу сцэнічнага мастацтва; 4) арганічнасць творчасці акцёра; 5) творчае пераўвасабленне акцёра ў вобраз.

*Тэма 2. Фізічны апарат артыста*

Фізічнае самапачуццё. Вызваленне мышцаў. Хуткасць рэакцыі. Каардынацыя ў прасторы. Свабода ўнутраная і знешняя. Знешняя свабода як вынік свабоды ўнутранай. Мускульны кантралёр. Мізансцэна і пластычная выразнасць артыста. Выхаванне сцэнічнай свабоды. Сцэнічная «заціснутасць» і спосабы пераадолення. Практыкаванні на «памяць фізічных дзеянняў». Хуткасць рэакцый як уласцівасць характару чалавека, неабходная якасць пры падрыхтоўцы акцёра ў сучасных умовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Сцэнічная ўвага*

Увага ў жыцці і на сцэне. Аб’екты сцэнічнай увагі. Тры колы ўвагі. Адвольная і мэтанакіраваная ўвага. Валявы пачатак і сцэнічная ўвага. Бесперапынная лінія ўвагі. Чатыры аспекты працэсу ўвагі: утрымліваць аб’ект, прыцягваць яго да сябе, імкнуцца да яго, пранікаць у яго. Увага як сродак знаходжання сцэнічнага матэрыялу. Роля ўвагі і назіральнасці ў творчасці акцёра і рэжысёра. Формы зносін з глядзельнай залай.

### *Тэма 4. Імправізацыя як элемент акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства*

К. С. Станіслаўскі, Ю. А. Завадскі, Г. А. Таўстаногаў аб імправізацыйным характары акцёрскай творчасці. Імправізацыя – сцэнічная гульня, не абумоўленая тэкстам і не падрыхтаваная на рэпетыцыях. Імправізацыя – сродак набліжэння да адчування жыццёвай праўды і развіцця неабходных творчых здольнасцей. Імправізацыя на прапанаваную тэму. Эцюды на групавую імправізацыю. Увядзенне дадатковых нечаканых абставін падчас выканання групавога імправізацыйнага эцюда. Імправізаваныя біяграфіі рэчаў і незнаёмых людзей. Выхаванне творчай смеласці і хуткасці рэакцыі на нечаканыя падзеі.

### *Тэма 5. Пачуццё праўды і вера*

Сцэнічныя праўда і вера. Магічнае «калі б». Выхаванне сцэнічнай веры. Сцэнічнае апраўданне – шлях да сцэнічнай веры. Логіка і паслядоўнасць дзеянняў. Прапанаваныя абставіны. Непасрэднасць і вера ў прыдуманыя абставіны – важныя ўласцівасці характару акцёра. Імправізацыя як спосаб рэпеціравання і сродак пазбягання штампаў.

### *Тэма 6. Сцэнічныя фантазія і ўяўленне*

Уяўленне і фантазія як рухавікі сцэнічнага жыцця артыста. Роля фантазіі ў ператварэнні жыццёвых фактаў у сцэнічныя. Спецыфіка акцёрскага ўяўлення. Уяўленне як здольнасць аднаўлення ў свядомасці жыццёвага вопыту, г.зн. таго, што ў мінулым здаралася з чалавекам. Фантазія як здольнасць камбінаваць вопыт суадносна з творчай задачай і на гэтай аснове ствараць новае. Акцёрскае ўяўленне і яго роля ў працэсе работы над вобразам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Сцэнічнае дзеянне*

Падзея і яе роля ў развіцці сцэнічнага дзеяння. Прычыны, якія абуджаюць дзеянне. Канфлікт як узбуджальнік дзеяння. Дзеянне для дасягнення вызначанай мэты. Дзеянне як сукупнасць мэты і валявога пасылу. Фізічнае і псіхічнае дзеянні. Віды псіхічных дзеянняў. Падпарадкаванне псіхічных задач фізічным. Непарыўная лінія дзеяння. Барацьба і пераадоленне перашкод – неабходная ўмова актывізацыі дзеяння. Складнікі дзеяння: ацэнка, прыстасаванне, выбар спосабу дзеяння, непасрэднае дзеянне. Моўнае дзеянне. Тэкст і падтэкст як формы сцэнічнага дзеяння. Метад фізічных дзеянняў К. С. Станіслаўскага і «біямеханіка» У. Э. Мейерхольда.

## Раздзел II. Прырода акцёрскай і рэжысёрскай творчасці ў інтэрпрэтацыі сістэмы К. С. Станіслаўскага (частка 2)

*Тэма 8. Скразное дзеянне і звышзадача*

Вучэнне К. С. Станіслаўскага аб звышзадачы. Звышзадача і скразное дзеянне – галоўныя элементы творчасці акцёра і рэжысёра. Скразное дзеянне – шлях да дасягнення звышзадачы. Вызначэнне ланцужка падзей, накіраваных для дасягнення звышзадачы. Неабходнасць духоўнага інтэлектуальнага ўзбагачэння асобы рэжысёра і акцёра для глыбокага пранікнення ў свет аўтара, у яго задуму, спасціжэнне звышзадачы. Дакладнае і трапнае вызначэнне звышзадачы. Логіка сцэнічнага дзеяння і звышзадача. Падмена логікі дзеяння гульнёй пачуццяў і станаў як парушэнне сэнсу сцэнічнага дзеяння, логікі паводзін персанажа.

*Тэма 9. Рэжысёрская задача – рухавік сцэнічнага дзеяння*

Элементы сцэнічнай задачы: што я раблю; дзеля чаго; як я гэта раблю. Пастаноўка задач – мова рэжысёра. Часткі і задачы. Сцэнічныя адносіны і ацэнка фактаў. Змена адносінаў да прадмета і месца дзеяння. Рэжысёрская задача выканаўцы падчас яго існавання ў «зоне маўчання». Рэжысёрскае тлумачэнне і рэжысёрскі паказ.

*Тэма 10. Сцэнічныя адносіны*

Сцэнічныя адносіны. Прыстасаванне. Залежнасць прыстасавання ад задачы. Імправізацыя і фіксацыя прыстасаванняў. Пе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ратварэнне прыстасавання ў дзеянне. Сцэнічныя адносіны як унутранае і знешняе ўздзеянне партнёраў, узаемадзеянне. Стадыі працэсу сцэнічных зносін: арыентацыя ў прапанаваных акалічнасцях, выбар аб'екта; падыход да аб'екта, прыцягненне яго ўвагі; перадача аб'екту сваіх бачанняў пры дапамозе слоў, інтанацый, прыстасаванняў і інш.; водгук аб'екта ў адказ і ўзаемны ўплыў адзін на другога. Сцэнічная ацэнка як працэс пераходу з адной падзеі ў іншую. Эцюды на сцэнічныя адносіны ва ўмовах арганічнага маўчання.

### *Тэма 11. Тэмпарытм сцэнічнага дзеяння*

Тэмпарытм сцэнічнага дзеяння. Унутраны і знешні тэмпарытм. Тэмпарытм дзеяння, тэмпарытм мовы. Сувязь тэмпарытму і ўнутранага жыцця артыста ў ролі. Разгляд тэмпу не толькі як хуткасць рухаў, але і іх характар: плаўны, скачкападобны, паскораны, запаволены, перарывісты, бесперапынны і г.д. Рытм як інтэнсіўнасць і размеранасць развіцця дзеяння. Стварэнне адзінкавых і групавых эцюдаў на арганічную змену тэмпарытму.

### *Тэма 12. Народнае мастацтва – крыніца рэжысёрскага натхнення*

Народнае мастацтва – крыніца рэжысёрскага натхнення. Этапы працы з узорамі фальклорнай народнай творчасці. Традыцыя і межы рэжысёрскай свабоды пры ўвасабленні фальклорнай спадчыны. Міфы, легенды, паданні як аснова для стварэння эцюда, гульнявой праграмы, прадстаўлення, святочнай кампазіцыі.

### *Тэма 13. Звышзадача мастака*

Звышзадача – адлюстраванне галоўных імкненняў душы мастака. Сувязь звышзадачы творчасці са светапоглядам мастака. Грамадзянская пазіцыя рэжысёра-творцы. Асэнсаванне рэжысёрскага мастацтва ў гістарычным кантэксце і ў сувязі з іншымі відамі мастацтва і літаратуры, агульным развіццём гуманітарных ведаў, з рэлігійнымі, філасофскімі, эстэтычнымі ідэямі канкрэтных гістарычных перыядаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Рэжысёрская інтэрпрэтацыя сцэнічнага твора

*Тэма 14. Пераклад празаічнага твора на мову сцэнічнага дзеяння*

Выбар твора і задума будучай пастаноўкі. Звышзадача аўтара і звышзадача рэжысёра. Рэжысёрская трактоўка празаічнага твора. «Увасабленне канфлікту ў выглядзе дыялогу дзеючых асоб і рэмарак аўтара» (У. Волькенштэйн). Захаванне аўтарскай задумы пры неабходнасці новай кампазіцыйнай будовы твора. Трансфармацыя ў дзеянне апісальнай прозы. Перапрацоўка сюжэта твора згодна з рэжысёрскай задумай. Межы рэжысёрскай свабоды падчас работы над аўтарскім творам. У чым сучаснасць выбранага твора?

*Тэма 15. Рэжысёрскі аналіз празаічнага твора*

Вызначэнне тэмы, ідэі, звышзадачы, падзейнага рада. Характарыстыка персанажаў. Вызначэнне кола прапанаваных абставін і кожнага персанажа твора. Пабудова ланцужка падзей (скразное дзеянне). Вызначэнне галоўнай падзеі твора і яе ўплыў на развіццё дзеяння. Выяўленне супрацьлеглых сіл. Вызначэнне стылістычных і жанравых асаблівасцей акцёрскага ўвасаблення. Першыя бачанні вобразнага рашэння будучай пастаноўкі.

*Тэма 16. Вывучэнне асяроддзя, адлюстраванага ў творы*

Сістэма поглядаў аўтара. Усебаковае вывучэнне эпохі, адлюстраванай у творы; яе асаблівасці: палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя, ваенныя, маральныя, навукова-філасофскія, культурныя. Характарыстыка часу, у які адбываюцца падзеі. Адлюстраваныя ў творы норавы, быт, традыцыі, сацыяльнае кола грамадства, яго субкультура. Месца, якое займаюць героі твораў у сацыяльнай структуры грамадства.

*Тэма 17. Канфлікт – аснова сцэнічнага дзеяння*

Канфлікт і ўзаемадзеянне – галоўныя катэгорыі акцёрскай і рэжысёрскай тэхналогіі. Вызначэнне галоўных памкненняў персанажаў. Расстаноўка супрацьлеглых сіл і вызначэнне галоўнай лініі дзеяння і лініі супрацьдзеяння. Барацьба – абавяз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ковая ўмова развіцця дзеяння. Вызначэнне прадмета барацьбы. Канфлікт як узбуджальнік працэсу барацьбы. Вызначэнне прадмета барацьбы. Галоўны і другасны канфлікты. Выяўленне канфлікту паміж будзённым жыццём героя і жыццём, якім ён жадае жыць і да якога імкнецца. Сцэнічнае дзеянне як актыўная паслядоўнасць сутыкненняў, ацэнак, рэакцый, спрэчак (не словам, а ўчынкамі, усім характарам персанажа).

*Тэма 18. Кампазіцыйная будова пастаноўкі*

Вызначэнне кампазіцыйнай будовы празаічнага твора і пастаноўкі: падабенства і адрозненні. (У выпадку выбару ўрыўка з празаічнага твора – вызначэнне месца, якое ўрывак, выбраны для пастаноўкі, займае ў агульнай кампазіцыйнай будове твора.) Будова архітэктонікі пастаноўкі: пралог, экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя (катарсіс), фінал.

*Тэма 19. Вобразнае рашэнне сцэнічнага твора*

Паняцце «мастацкі вобраз». Асэнсаванне вобраза пастаноўкі, які адпавядае рэжысёрскай звышзадачы і жанрава-стылістычным асаблівасцям твора. Вызначэнне прынцыпаў мастацка-дэкаратыўнага, музычнага і пластычнага рашэнняў пастаноўкі. Рашэнне пастаноўкі ў часе (у тэмпарытмах) і ў прасторы (у характары мізансцэн і планіровак). Мастацкі вобраз – вынік шматбаковых роздумаў рэжысёра аб жыцці і творчасці, а таксама параўнанняў падзей, закранутых у творы, з падзеямі навакольнага жыцця, з уласнымі пачуццямі і крэда асобы пастаноўшчыка. Мастацкі вобраз твора як вынік глыбокага разумення і адчування рэжысёрам матэрыялу, выбранага для ўвасаблення.

*Тэма 20. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка празаічнага твора*

Сцэнарый (італ. scenario, ад лац. scaena, scena – сцэна) – сціслы выклад у літаратурной форме сюжэта відовішчнага прадстаўлення, манеры акцёрскага выканання, а таксама тэхналагічных асаблівасцей яго пастаноўкі. Інсцэніроўка – гэта перапрацоўка празаічнага ці паэтычнага твора для тэатра ці тэатралізаванага відовішча. Сцэнарый (інсцэніроўка) як рэжысёрская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задума відовішча, адлюстраваная ў драматургічнай форме. Назапашванне сцэнарных ідэй у працэсе працы над інсцэніроўкай. Кампазіцыйная будова эпізодаў сцэнарыя (інсцэніроўкі). Моўныя характарыстыкі герояў і іх уплыў на выразнасць характараў персанажаў. Сцэнарна-рэжысёрскі ход як прыём, які аб'ядноўвае разрозненыя часткі відовішча ў адзінае драматургічнае цэлае. Аўтарскія рэмаркі і спасылкі на запазычаныя элементы сцэнарыя (інсцэніроўкі). Тэхналогія афармлення рэжысёрскага сцэнарыя (інсцэніроўкі).

## Раздзел IV. Сцэнічнае ўвасабленне празаічнага твора

*Тэма 21. Праца рэжысёра з выканаўцамі*

Дакладнае размеркаванне роляў – палова поспеху пастаноўкі. Рэжысёрская эксплікацыя пастаноўкі. Стварэнне неабходнай атмасферы рэпетыцыйнага працэсу. Творчая дысцыпліна і адказнасць на рэпетыцыях. Рэпетыцыя – сутворчасць рэжысёра і выканаўцы. Разбіўка інсцэніроўкі на рэпетыцыйныя эпізоды. Варыятыўнасць рэпетыцыйнай работы.

*Тэма 22. Асаблівасці рэпетыцыйнага працэсу*

План рэпетыцыйнай дзейнасці. Віды рэпетыцый: застольныя, планіровачныя, мантажныя, зводныя, генеральныя. Структура рэпетыцыйнага працэсу. Атмасфера і характар правядзення першай рэпетыцыі з выканаўцамі. Асаблівасці пераходу ад застольнага перыяду да рэпетыцый у выгарадках. Метад падзейнага аналізу – прафесійны інструмент рэжысёра. Творчая дысцыпліна і «рухавікі» інтарэсу выканаўцаў.

*Тэма 23. Скразное дзеянне ўрыўка і скразное дзеянне ролі*

Вызначэнне скразнога дзеяння ўрыўка як часткі скразнога дзеяння твора. Пошукі вытокаў скразнога дзеяння за межамі твора. Скразное дзеянне ролі. Перспектыва ролі, перспектыва артыста. Актывізацыя выканаўцаў па вывучэнні асяроддзя, адлюстраванага ў творы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 24. Характар і характарнасць*

Сутнасць мастацтва пераваўсаблення. Тры фактары пераўвасаблення (па Г. А. Таўстаногаву): змяненне спосабу мыслення, рытму жыцця, адносінаў да навакольнага свету. «Іерархія мэтаў» – ключ да раскрыцця характару. Моўная і пластычная характарыстыкі парсанажа як шлях да індывідуалізацыі яго характару.

*Тэма 25. Вобразнае рашэнне пастаноўкі*

Мізансцэна – мова рэжысёра. Стылявыя асаблівасці пастаноўкі. Спосаб зносінаў з глядзельнай залай. Адзінства пластычнага і музычнага вобразаў пастаноўкі. Дасягненне ансамблевасці ў акцёрскім выкананні. Адзіны вобраз мастацка-дэкаратыўнага афармлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Гиппиус, С. В.* Актерский тренинг. Гимнастика чувств / С. В. Гиппиус. – СПб. : Прайм-Еврознак, 2006. – 377 с.

*Захава, Б. Е.* Мастерство актера и режиссера : учеб. пособие для спец. учеб. заведений культуры и искусства / Б. Е. Захава. – 4-е. изд., испр. и доп. – М. : Просвещение, 1978. – 334 с.

*Завадский, Ю. А.* Об искусстве театра / Ю. А. Завадский. – М. : ВТО, 1965. – 347 с.

*Кипнис, М.* Актерский тренинг / М. Кипнис. – М. : АСТ : АСТ Москва ; СПб. : Прайм-Еврознак, 2008. – 249 с.

*Корогодский, З. Я.* Первый год. Начало / З. Я. Корогодский. – М. : Сов. Россия, 1974. – 128 с.

*Корогодский, З. Я.* Первый год. Продолжение / З. Я. Корогодский. – М. : Сов. Россия, 1974. – 112 с.

*Кнебель, М. О.* Поэзия педагогики / М. О. Кнебель. – 2-е изд. – М. : ВТО, 1984. – 526 с.

*Кох, И. Э.* Основы сценического движения / И. Э. Кох. – Л. : Искусство, 1970. – 566 с.

*Кристи, Г. В.* Воспитание актера школы Станиславского / Г. В. Кристи. – М. : Искусство, 1968. – 455 с.

*Немеровский, А. Б.* Пластическая выразительность актера : учеб. пособие для театр. вузов / А. Б. Немеровский. – М. : Искусство, 1976. – 128 с.

*Новицкая, Л. П.* Изучение элементов актерского мастерства. Тренинг и муштра / Л. П. Новицкая. – М. : Сов. Россия, 1969. – 272 с.

*Пави, П.* Словарь театра / П. Пави. – М. : Прогресс, 1991. – 504 с.

Режиссерские экземпляры К. С. Станиславского, 1898–1930 : в 6 т. / вступ. ст. Ю. А. Завадского. – М. : Искусство, 1980. – Т. 1. – (Театральное наследие).

*Ремез, О. Я.* Мастерство режиссера: пространство и время спектакля : учеб. пособие для студ. театр. вузов и ин-тов культуры / О. Я. Ремез. – М. : Просвещение, 1983. – 144 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Сарабьян, Э.* Актерский тренинг по системе Георгия Товстоногова / Э. Сарабьян. – М. : АСТ ; Владимир : ВКТ, 2010. – 320 с. – (Золотой фонд актерского мастерства).

*Станиславский, К. С.* Работа актера над собой в творческом процессе переживания / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1951. – 667 с.

*Станиславский, К. С.* Моя жизнь в искусстве / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1962. – 575 с.

*Товстоногов, Г. А.* Зеркало сцены : в 2 кн. / Г. А. Товстоногов ; сост. Ю. С. Рыбаков. – Л. : Искусство, 1980. – Кн. 2. Статьи. Записи репетиций. – 311 с.

*Дадатковая*

*Акимов, Н. П.* Театральное наследие / Н. П. Акимов ; под ред. С. Л. Цимбала ; сост. В. М. Миронов. – Л. : Искусство, 1978. – Кн. 2. Об искусстве театра. О режиссуре. Режиссерские экспликации и заметки. – 287 с.

*Бояджиев, Г. Н.* От Софокла до Брехта за сорок театральных вечеров / Г. Н. Бояджиев. – М. : Просвещение, 1969. – 359 с.

*Горчаков, Н. М.* Режиссерские уроки К. С. Станиславского / Н. М. Горчаков. – М. : Искусство, 1951. – 564 с.

*Ершов, П. М.* Режиссура как практическая психология / П. М. Ершов. – М. : Мир искусства, 2010. – 408 с.

*Захаров, М. А.* Контакты на разных уровнях / М. А. Захаров. – М. : Искусство, 1987. – 270 с.

*Лордкипанидзе, Н. Г.* Режиссер ставит спектакль / Н. Г. Лордкипанидзе. – М. : Искусство, 1990. – 228 с.

*Немирович-Данченко, В. И.* Рождение театра. Воспоминания, статьи, заметки, письма / В. И. Немирович-Данченко ; сост., вступ. ст. и коммент. М. Н. Любомудрова. – М. : Правда, 1989. – 576 с.

*Попов, А.* Спектакль и режиссер / А. Попов. – М. : ВТО, 1961. – 128 с.

*Петров, Н.* Режиссер читает пьесу / Н. Петров. – Л. : Худож. лит., 1934. – 147 с.

*Станиславский, К. С.* Мое гражданское служение России: Воспоминания. Статьи. Очерки. Речи. Беседы. Из записных книжек / К. С. Станиславский ; сост., вступ. ст. и коммент. М. Н. Любомудрова. – М. : Правда, 1990. – 656 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станиславский репетирует. Записи и стенограммы репетиций / сост., ред., вступ. ст. И. Виноградская. – М. : СТД РСФСР, 1987. – 592 с.

*Стреллер, Д.* Театр для людей / Д. Стреллер. – М. : Радуга, 1984. – 308 с.

*Ульянов, М. А.* Работаю актером / М. А. Ульянов. – М. : Искусство, 1987. – 398 с.

*Элсам, П.* Мастер-класс для начинающего актера / П. Элсам ; пер. с англ. А. Ковалева. – Ростов н/Д : Феникс, 2008. – 252 с. – (Театральная мастерская).

*Эфрос, А. В.* Репетиция – любовь моя / А. В. Эфрос ; послесл. Ю. А. Завадского. – М. : Искусство, 1975. – 319 с.

*Эфрос, А. В.* Профессия : режиссер / А. В. Эфрос. – М. : Искусство, 1979. – 367 с.

*Эфрос, А. В.* Продолжение театрального рассказа / А. В. Эфрос. – М. : Искусство, 1985. – 399 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў распрацаваны з улікам шматгадовай практыкі правядзення залікова-экзаменацыйных сесій па агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплінах.

**10 балаў** – ставіцца ў выключных выпадках, калі студэнт дэманструе высокі ўзровень ведаў тэорыі, практычных навыкаў валодання рэжысёрскай прафесіяй і выдатнае выканальніцкае майстэрства; дае вычарпальна аргументаваныя адказы на пастаўленыя тэарэтычныя пытанні; упэўнена выкарыстоўвае навыкі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў рэжысёрскай практыцы; граматна прымяняе спецыяльную тэрміналогію; дэманструе шырокую эрудыцыю і веданне сучасных тэндэнцый у галіне рэжысёрскага і акцёрскага мастацтва.

**9 балаў** – ставіцца, калі студэнт дэманструе высокі ўзровень ведаў тэорыі, практычных навыкаў валодання рэжысёрскай прафесіяй і добрае выканальніцкае майстэрства; упэўнена выкарыстоўвае навыкі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў рэжысёрскай практыцы; граматна прымяняе спецыяльную тэрміналогію; добра ведае і ўпэўнена карыстаецца метадычнай літаратурай па спецыяльных дысцыплінах; дэманструе веданне сучасных тэндэнцый у галіне рэжысёрскага мастацтва.

**8 балаў** – ставіцца, калі студэнт дэманструе добры ўзровень ведаў тэорыі, практычных навыкаў авалодання рэжысёрскай прафесіяй і выканальніцкае майстэрства; дастаткова ўпэўнена карыстаецца навыкамі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў рэжысёрскай практыцы; валодае спецыяльнай тэрміналогіяй; ведае метадычную літаратуру па спецыяльных дысцыплінах.

**7 балаў** – ставіцца, калі студэнт дэманструе дастатковы ўзровень ведаў тэорыі, практычных навыкаў валодання рэжысёрскай прафесіяй і выканальніцкага майстэрства; выкарыстоўвае навыкі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў рэжысёрскай практыцы; ведае і прымяняе спецыяльную тэрміналогію; здольны працаваць з метадычнай літаратурай, але няўпэўнена арыентуецца ў сучасных тэндэнцыях развіцця рэжысёрскага мастацтва.

**6 балаў** – ставіцца, калі студэнт дэманструе сярэдні ўзровень ведаў тэорыі, практычных навыкаў валодання рэжысёрскай прафесіяй і здавальняючы выканальніцкага майстэрства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

валодае ў дастатковай ступені навыкамі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы, але няўпэўнена прымяняе спецыяльную тэрміналогію; здольны працаваць з метадычнай літаратурай, але няўпэўнена арыентуецца ў сучасных тэндэнцыях развіцця рэжысёрскага мастацтва.

**5 балаў** – ставіцца, калі студэнт дэманструе сярэдні ўзровень ведаў тэорыі і недастаткова сфарміраваныя навыкі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы; дапускае пэўныя недакладнасці ў прымяненні спецыяльнай тэрміналогіі; недастаткова ўпэўнена арыентуецца ў метадычнай літаратуры.

**4 балы** – ставіцца, калі студэнт дэманструе здавальняючы ўзровень ведаў тэорыі і недастаткова сфарміраваныя навыкі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы; ведае асноўную метадычную літаратуру, але няўпэўнена прымяняе спецыяльную тэрміналогію.

**3 балы** – ставіцца, калі студэнт дэманструе нізкі ўзровень ведаў тэорыі і адчувае няўпэўненасць у навыках пастановачнай і рэпетыцыйнай работы; абмежавана прымяняе спецыяльную тэрміналогію; не арыентуецца ў сучасных тэндэнцыях развіцця рэжысёрскага мастацтва; дэманструе фрагментарнае веданне спецыяльнай метадычнай літаратуры.

**2–1 балы** – выстаўляюцца, калі ў студэнта адсутнічаюць веды па тэорыі рэжысуры і навыкі пастановачнай і рэпетыцыйнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Кантроль засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца пры дапамозе наступных сродкаў дыягностыкі:

– метады вуснай дыягностыкі ведаў (вуснае апытанне, гутаркі, дыспуты, залік, экзамен);

– метады графічнай дыягностыкі (пісьмовая работа, рэферат, рэжысёрская эксплікацыя, пісьмовы даклад);

– метады практычнай дыягностыкі (паказы практыкаванняў і эцюдаў, самастойнае правядзенне рэпетыцый, праца студэнтаў-пастаноўшчыкаў з выканаўцамі, правядзенне паказаў творчых работ);

– інтэрактыўныя метады дыягностыкі (выкарыстанне гульнявых прыёмаў актывізацыі, сітуатыўныя задачы, дэбаты).

*Вучэбнае выданне*

**АСНОВЫ РЭЖЫСУРЫ І МАЙСТЭРСТВА АКЦЁРА**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці*
*1-17 01 05-1 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*


Рэдактар В. В. Каташвілі
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 0,76. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ